# ДА 70-ГОДДЗЯ

# ВІКТАРА ГЕОРГІЕВІЧА КУРЛОВІЧА



## Дарагі Віктар Георгіевіч!

Вось і чарговая круглая дата на календары. Яшчэ адна веха на доўгім жыццёвым шляху сапраўднага грамадзяніна, патрыёта, адоранай талентам творчай асобы. У такія дні прынята падводзіць вынікі. Замест справаздач прапануем прызнанне ў нашай сяброўскай сімпатыі да Вашай чалавечнасці, бязмежную павагу да Вашай літаратурнай спадчыны, дзе кожны верш, кожны радок напісаны сэрцам. Шаноўны сябра, ад імя нашага калектыву віншуем Вас з 70-годдзем. Прыміце з гэтай нагоды нашы шчырыя пажаданні здароўя, дабрабыту, невычэрпнай жыццёвай і творчай энергіі. Няхай кожнае імгненне жыцця прыносіць радасць, прымнажае ўнутраныя святло і цяпло, якімі Вы шчодра адорваеце ўсіх, хто побач. Зычым, каб усе мары і надзеі збываліся, а ўсе планы і пастаўленыя мэты ператвараліся ў высокія дасягненні і перамогі. **З ЮБІЛЕЕМ!**

**Калектыў**
**Гродзенскага абласнога аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**

*18 лютага 2025 года*
*Гродна-Вярэйкі*

